# Памятка па рабоце над памылкамі па беларускай мове

1. **ПРОПУСК, ЗАМЕНА ЛІТАР.** Напішы слова правільна, падкрэслі літару, пастаў націск. Запішы слова яшчэ раз, падзяляючы яго на склады. Рабі так: *маліна, ма-лі-на.*

**2.ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў КАНЦЫ СКАЗА.** Напішы сказ, пастаў патрэбны знак, падкрэслі яго. Запішы яшчэ адзін сказ з такім знакам. Рабі так: *Прыляцела ластаўка. Прашумела навальніца.* Або: *Якая прыгажосць! Гэта ж вавёрка!*

**Запомні!** Сказы перадаюць закончаную думку. У канцы сказа ставіцца кропка(.), пытальнік(?) або клічнік(!). Выбар знака прыпынку залежыць ад сэнсу сказа і інтанацыі, з якой ён вымаўляецца.

**3.ВЯЛІКАЯ ЛІТАРА Ў ПАЧАТКУ СКАЗА.** Напішы сказ правільна. Прыдумай і запішы яшчэ адзін сказ, падкрэслі вялікую літару. Рабі так: *Узняўся вецер. Паліў дождж.* **Запомні!** Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары.

**4.ВЯЛІКАЯ ЛІТАРА Ў СЛОВАХ.** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі вялікую літару. Рабі так: *Васіль, Вольга, Янка.* Або: *Нёман, Днепр, Свіслач.*

**Запомні!** Імёны, імёны па бацьку і прозвішчы пішуцца з вялікай літары: *Пётр Ільіч Клімук.* Мянушкі жывёл пішуцца з вялікай літары: *кот Цішка, курыца Чубатка.* Назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц, рэк, азёр, мораў пішуцца з вялікай літары: *рака Нарач, горад Полацк, возера Нарач.*

**5. ПЕРАНОС СЛОЎ.** Напішы слова правільна, падзяляючы яго на склады для пераносу. Запішы яшчэ тры словы, падзяляючы іх для пераносу. Рабі так: *асі-на, сяб-роў-ка, лі-лея, агу-рок.*

**Запомні!** Словы трэба пераносіць па складах. Адну літару нельга пакідаць на

радку ці пераносіць на другі радок : *пяю, юнак.* Літары й, ў, ь і апостраф ‘ пры пераносе нельга аддзяляць ад папярэдняй літары: *пай-шлі, роў-ны, кань-кі, бур’-ян.* Пры пераносе слоў з падоўжанымі зычнымі ці слоў са спалучэннем зычных на наступны радок пераносіцца ўсё гэтае спалучэнне альбо любая яго частка: *ся-стра, сяс-тра, сяст-ра, калос-се, кало-ссе, су-ддзя, суд-дзя.* Пры пераносе слоў літары дз, дж, падзяляць нельга: *сту-дзень, ся-джу.*

**6.СЛОЎНІКАВЫЯ СЛОВЫ.** Напішы слова правільна, падзялі яго на склады. пастаў націск. Рабі так: *дрымучы, дры-му-чы.*
**Запомні**! Напісанне гэтых слоў трэба запомніць ці паглядзець у слоўніку.

**7.ПРАВАПІС Ў.** Напішы слова або словазлучэнне правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла. Падкрэслі галосную перад ў. Рабі так: *маляваў, чытаў, дрэўца.* Або: *жыве ў лесе, хацелася ўбачыць.*

**Запомні!** Літара ў пішацца заўсёды пасля галосных у сярэдзіне слова, у канцы і ў пачатку, калі папярэдняе слова заканчваецце на галосную, пад націскам: *лоўка, пайшоў, пакаціўся ўніз*. Пасля знакаў прыпынку пішацца толькі у. Літара ў не бывае вялікай: *вуліца Усходняя, балерына Уланава.*

**8.ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ *О, Э, А.*** Напішы слова правільна. Запішы, ад якога слова яно ўтварылася, пастаў націск. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла. Рабі так: *дамы – дом, гарады – горад, бары – бор.* Або: *рака – рэкі, шаптаць – шэпчуць, цана – цэны.*

**Запомні!** У беларускай мове галосныя о, э могуць быць толькі пад націскам. не пад націскам на іх месцы пішацца а.

**9.ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ *Е, Ё, Я.*** Напішы слова правільна, пастаў яго ў множны лік, абазнач націск. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла. *Рабі так*: *сяло – сёлы, вярба – вербы, зямля – землі.*

**Запомні!** У беларускай мове замест літар е,ё ў першым складзе перад націскам пішацца я. Трэба памятаць, што ў другім складзе перад націскам літара е не замяняецца на я: *ле-са-вік, ле-дзя-ны.*

**10. ПАРНЫЯ ЗВОНКІЯ І ГЛУХІЯ ЗЫЧНЫЯ.** Напішы слова правільна, падбяры праверачнае. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла. Рабі так: *грыб – грыбы, плод – плады, нізкі – нізенькі.*

**Запомні!** Напісанне слоў з парнымі зычнымі на канцы слова і перад глухімі зычнымі трэба правяраць. Для гэтага неабходна такім чынам змяніць слова, каб пасля зычнага стаяў галосны. Звонкія і глухія ўтвараюць наступныя пары: б-п, г-х, д-т, дз-ц, дж-ч, ж-ш, з-с.

**11.АБАЗНАЧЭННЕ МЯККАСЦІ ЗЫЧНЫХ НА ПІСЬМЕ МЯККІМ ЗНАКАМ.** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з ь. Рабі так: *вугаль, рысь, канькі, бульба.*
**Запомні!** Мяккасць зычных гукаў абазначаецца на пісьме ь(мяккім знакам), а таксама літарамі е. ё, ю, я.

**12.ЗЫЧНЫЯ *Б, П,М, Ф,* НА КАНЦЫ СЛОЎ.** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычныя гукі на канцы слоў. Рабі так: *глыб, восем, россып.*

**Запомні!** Зычныя б, п, м, ф, на канцы слоў заўсёды вымаўляюцца цвёрда, таму на пісьме мяккі знак пасля іх не ставіцца.

**13.ЗЫЧНЫЯ *Ж, ДЖ, Ч, Ш, Р* І ГАЛОСНЫЯ ПАСЛЯ ІХ.** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай. Рабі так: *вожык, жалеза, жоўты.*

**Запомні!** У беларускай мове зычныя ж, дж, ч, ш, р – зацвярдзелыя, яны заўсёды вымаўляюцца цвёрда. пасля іх пішуцца галосныя а, о, у, э, ы.

**14 ПРАВАПІС *Д – ДЗ.*** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай. Рабі так: *дзень, дзеці, адзіны.*
**Запомні!** У беларускай мове гук [д] заўсёды цвёрды, а гук [дз'] – мяккі. Пасля д пішуцца літары а, о, у, ы, пасля дз –літары я, е, ё, ю, ь.

**15.ПРАВАПІС *Т – Ц.*** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай. Рабі так: *ляцеў, цень, ціха.*
**Запомні!** У беларускай мове гук [т] заўсёды цвёрды, а гук [ц'] – мяккі . Пасля т пішуцца літары а, о, у, э, ы. Пры змякчэнні цвёрды гук т змяняецца мяккім [ц']. Мяккасць [ц'] абазначаецца літарамі я, е, ё, ю, і. ь. У беларускай мове ёсць і цверды гук [ц]: *цэгла, цыбуля, цукар.*

**16.ПАДОЎЖАНЫЯ ЗЫЧНЫЯ.** Напішы слова правільна, падкрэслі падоўжаныя зычныя. Рабі так: *галлё, насенне, збожжа.*

**Запомні!** Падоўжанае вымаўленне зычных ж, з, л, н, с, ц, ч, ш на пісьме перадаецца дзвюма літарамі. Падоўжанае дз на пісьме перадаецца спалучэннем літар ддз: *суддзя, разводдзе.*

**17.РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫ МЯККІ ЗНАК (Ь).** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі ь і літару, якая стаіць перад ім. Рабі так: *залью, мільён, Ульяна.*

**Запомні!** Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля л,н перад галоснымі я, е, ё, ю, і.

**18. АПОСТРАФ (').** Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі літары, якія раздзяляюцца апострафам. Рабі так: *пер'е, вераб'і, сям'я.*
**Запомні!** У некаторых словах зычныя з галоснымі е, ё, і, ю, я вымаўляюцца раздзельна. На пісьме такое вымаўленне абазначаецца апострафам ('). Пасля ў апостраф не пішацца: *здароўе, салаўі.*

**19.ПРЫНАЗОЎНІК**. Напішы правільна прыназоўнік і слова, да якога ён адносіцца, паміж прыназоўнікам і словам устаў пытанне або іншае слова. Рабі так: *у лес*, *у* (які?) *лес*, *у* (восеньскі) *лес.*

**Запомні!** Словы у, на, за, са, да, па, з, пад, каля – прыназоўнікі. Прыназоўнікі з іншымі словамі пішуцца асобна. Паміж прыназоўнікам і наступным словам можна ўставіць пытанне ці якое- небудзь слова: *пад* (чым?) *бярозамі, пад* (маладымі) *бярозамі*. Перад дзеясловамі прыназоўнікі не ўжываюцца.

**20. *НЕ* З ДЗЕЯСЛОВАМІ.** Напішы правільна дзеяслоў і часціцу не. Запішы яшчэ два дзеясловы з часціцай не. Рабі так: *не чытала, не гавары, не шуміць*. **Запомні!** Не з дзеясловамі пішацца асабна.

**21. ПРАВАПІС ПРЫСТАВАК.** Напішы слова правільна, абазнач прыстаўку. Запішы яшчэ два словы з гэтай прыстаўкай. Рабі так: *зрабіць, знесці, здаваў*. Або: *спісаць, скаціць, спадаць.*

**Запомні!** Прыстаўка – гэта частка слова. Яна пішацца разам са словам. Напісанне прыставак трэба запомніць: па-, аб-, ад-, над -, пад-. Перад звонкімі зычнымі пішуцца прыстаўкі з-, уз-, раз-, без-, бяз-: *збіраць, узнікаць*. Перад глухімі зычнымі пішуцца прыстаўкі с-, ус-, рас-, бес-, бяс-: *схіліць, распісны*. Паміж прыстаўкай, якая заканчваецца на зычны, і коранем, які пачынаецца з літар е, ё, ю, я, пішацца апостраф: *з'есці, раз'юшаны.*